# Не было нам спання,
# жыцця не было

KAMUNIKAT.org

## Фёдар Аўсянюк, ВІТАВА:

Узброеныя зладзеі, што прыходзілі ў нашу вёску ноччу, забіралі ад гаспадароў харчы. Гаварылі яны на чыстай польскай мове і былі з больш аддаленых ад нас вёсак. Аднак маглі паказваць ім дарогу нейкія мясцовыя людзі. Найчасцей прыходзілі за харчамі перад святамі, калі гаспадары калолі вепрукоў. Калі мы закалолі свінчо, зладзеі наведалі і наш панадворак. Доўга стукалі ў акно, але мы баяліся і не ўпускалі іх у хату. Калі пачалі страшыць нас вінтоўкай, то мы адкрылі ім дзверы. Зладзеі думалі, што мы схавалі перад імі зброю і былі вельмі ўсхваляваныя. Забралі ў нас свежае мяса, іншыя прадукты ды новыя скураныя боты. Нават знайшлі схаваную над хатай у палове самагонку. Забраныя ў нас харчы павезлі на возе.

Пасля вайны некаторыя жыхары Вітава запісаліся ў Польскую рабочую партыю. Многа асоб стала дружыннікамі ОРМО. У Польскую рабочую партыю часцей запісваліся бяднейшыя гаспадары. Кулакоў у партыю не бралі, бо лічылі шкоднікамі народа.

## Ян Баравік, ГАРКАВІЧЫ:

Саланіннікі ў Савецкі Саюз не выганялі, рабавалі толькі. Яны пільна сачылі, хто што прадаў і пасля патрабавалі грошай. Мой цесць павёз свінчо прадаваць. Калі вярнуўся, на ягоны панадворак завіталі аматары лёгкага заробку:

— Ты вепрука прадаў... — прывіталіся.

— Не, не прадаў, назад прывёз.

— Пакажы!

А той парсюк яшчэ звязаны каля воза ляжаў. Але „госці” пацікавіліся іншым:

— А хто яшчэ што прадаў? — спыталі.

А тады і я жаробку з ялаўкай прадаў і за іх жняярку купіў. Зайшлі „госці” на падворак, пабачылі новую машыну:

— O, cholera, zdążył... — расчараваліся.

Аднак няпрошаныя госці рэдка заглядалі ў Гаркавічы, бо вёска была добра арганізавана і яны пабойваліся.

**Люба Белая, БЕЛАСТОК:**

Мой брат, як прайшоў фронт, запісаўся быў у міліцыю, але тата настойваў, каб ён, адзіны сын, выпісаўся. Баяўся за яго, бо акаўцы хадзілі. І брат выпісаўся з міліцыі. Аднойчы зайшлі ў нашу хату ў Дзернякове акаўцы, крыху каўбас узялі і пайшлі далей. Брата тады ў хаце не было, у суседзяў гуляў у карты. І хтось з ягоных калегаў падказаў акаўцам пра яго. Яны тады брата моцна пабілі, вярнуліся ў нашу хату, паведамілі пра здарэнне, усё ў нас зрэвідавалі, забралі ровар, рускі патэфон, сестрыну сукенку і касцюм. А тата з братавай жонкай ледзь прывялі яго. Калі брат акрыяў, пайшоў на службу ў УБ.

**Іван Врублеўскі, ДЭНІСКІ:**

У 1942 годзе немцы вывезлі мяне ў Германію, адкуль вярнуўся я ў 1945 годзе. Сталі ў нас хадзіць тады банды. Трэба было арганізаваць абарону ад іх. Запісаўся я ў армоўцы, у нашай вёсцы было нас трыццаць чалавек. Кожную ноч, ад змяркання да раніцы, пільнавалі вёску ад пажараў і пакражы. Хадзіла варта, чатыры мужчыны: два патрулі па два чалавекі — адзін армовец і адзін цывільны. Армоўцы мелі зброю: гранаты, аўтаматы і вінтоўкі; хадзілі ў мундзірах і ў сваёй вопратцы. Больш за дзесяць разоў паднімалі трывогу — білі ў рэйку. Злачынцы палілі стагі з сенам над Арлянкаю, раз і клуню ў вёсцы падпалілі. Адганялі іх самі. Варты былі ў кожнай вёсцы; на Плютычы і Райск банды нападалі часцей. Ездзілі таксама армоўцы на акцыі супраць бандаў у Браньск, Цехановец, Вышкі. Падчас рэферэндуму „Тры разы так" ахоўвалі мы выбарчы ўчастак у Гацьках. Пасля таго рэферэндуму банды перасталі хадзіць, і мы перасталі трымаць варты і здалі зброю. Мне, дарэчы, ніколі не давялося тою зброяй карыстацца.

## Міхал Высоцкі, ХАНЬКІ:

Пасля вайны іншыя хадзілі, гаварылі, што польскае войска яны. Некаторыя са зброяй, а некаторыя з кіямі былі. Адпраўлялі нас „do raju”. Жытнюю муку забіралі. У велікодную суботу 2,5–метровага вепрука забілі і павезлі. Не было нам спання, жыцця не было. Пасля захаду сонца хаваліся мы ў жыта або кусты. Калі чаго не хочаш даць, то білі. І вызначалі тэрмін 2–3 дні і давай грошы. Нікога не спалілі, не забілі, але білі многа. З Ханькоў і Касцюковіч чатыры сям'і выгналі. Выехалі яны недалёка, пабудаваліся, і не шкадавалі, гаварылі што „хорошо”. І нас выганялі, але мы асталіся.

## Аркадзь Дарошка, БАБРОЎНІКІ:

Да 1948 года наша вёска знаходзілася ў Савецкім Саюзе. Граніца праходзіла па полі — два кіламетры за вёскай. Былі на ёй дзве кантрольныя паласы, якія правяраліся пагранічнікамі. Першую паласу дазвалялася перасякаць сялянам на падставе пропускаў. 25 мая 1948 года адбылося карэктаванне граніцы. У выніку перасунулі яе 500 метраў на ўсход ад вёскі і ўсталявалі па цячэнні ракі Свіслач. Пасля гэтага вёскі Габяты, Баброўнікі, Ярылаўка, Коматаўцы, Рудакі, Ласіняны, Азяраны-Малыя, Азяраны-Вялікія адышлі да Польшчы.

## Яўген Ефімюк, КЛЯШЧЭЛІ:



У тым часе пазнаёміўся я з Дзмітрыем Макаравым, загадчыкам партызанскага руху ў Камянецкім, Кляшчэлеўскім і Сямятыцкім раёнах. Ён быў энкавэдыстам, але ў вайну пра гэта ніхто не ведаў. Пасля вызвалення ён 3–4 тыдні быў камендантам горада Кляшчэлі і ўсіх партызан высылаў на фронт, а мяне, маладога, паставіў у млын наглядаць, каб

салдаты не кралі і не прадавалі мукі; пасля Макараў выехаў у Маскву. Аднак мяне менш цікавіла вага, а больш лакамабіль, які прыводзіў у рух і млын, і тартак. Некалькі месяцаў працаваў я там памочнікам механіка, а потым механікам, без курсаў. Працавалі мы па 24 гадзіны ў суткі: у нядзелю ставалі і ў нядзелю сходзілі. Драмаў і чуў, як машына ходзіць. А тады „свабода" была і людзі дрэва з лесу везлі, каб прапілаваць. Прывозілі гарэлку, закуску — абы рабіць. І сто працэнтаў плацілі, калі „па гадзінах", вечарам…

Аднойчы, вечарам, бачу жэст рукі кіраўніка Яна Радзікоўскага каб спыніць лакамабіль. Я спыніў, а мне салдат у польскім мундзіры прыкладам па галаве:

— Ja cię, sk...synie, zatrzymam!

Хлопцы па два пісталеты мелі, кожны аўтамат. І грошы забралі. У Радзікоўскага забралі грошы і кашалёк. Ён да „Млота" пайшоў і „Млот" сказаў кашалёк вярнуць, а грошы не. Радзікоўскі просіць, каб квітанцыю даў, колькі грошай забралі. А „Млот" адказаў, што 36 тысяч, якія ў гміне, таксама забяруць і таксама без ніякай квітанцыі. Паўгадзіны пазней было чуваць як на пераездзе ручная піла працуе; яны тэлефонныя стаўпы зрэзалі і перарэзалі ўсе драты.

Крыху пастралялі і апанавалі пастарунак. Некалькім рукі дратамі пазвязвалі. Паклікалі на пастарунак і сакратара партыі Антонія Савіцкага. Ён думаў, што гэта легальныя салдаты, а яны яму пісталет забралі. Ён пабачыў тых звязаных і электралямпачку, што адна толькі свяцілася, пабіў. І ўсе паўцякалі: і тыя, што звязаныя былі, і тыя, што іх пільнавалі. Адзін са звязанымі рукамі да раніцы ў фасолі прасядзеў.

## Ян Жак, КАЎПАКІ:

Вярнуўся я з канцлагера Штутгаф у Каўпакі ў канцы красавіка, а тут немец усё спаліў; няма ні вопраткі, ні ежы; палова вёскі жыла ў маёнтку ў Малынцы. Жонку з дзяць-

мі немец выпусціў толькі ў 1944 годзе. Вярнуўшыся, я два тыдні дома не начаваў, бо пад шыльдай акаўцаў розныя банды хадзілі; у Патоцы забілі 4 чалавек, у тым і майго швагра, што сястру трымаў, а вёску спалілі. У Подварках забілі пару чалавек, у Жыўкове, адну сям'ю ў Пухлах. Прыйшлі і ў Малынку, у дом, дзе я акурат быў, і пытаюць, хто ў пакойчыку жыве. Сказалі ім, што дзве ўдавіцы. Ну і яны не заглядалі, паехалі. І так я астаўся ў жывых.

**Аляксандр Зінчук, БАЦЮТЫ:**

Банды па начах хадзілі, грабілі коней, свіней, швейныя машыны, кажухі. Не было спакою, людзі баяліся, уцякалі. У нашай вёсцы асталося менш чым чацвёртая частка — апошнія выехалі ў Беларусь, у Расію, на цаліну. Сюды прыехалі з Беларусі, але і з іх мала ўжо хто астаўся; цяпер мазурня. У Зачарлянах да вайны амаль усе былі праваслаўныя, былі толькі тры польскія сям'і, а цяпер ніводнай праваслаўнай не асталося. І ў Гаеўніках ніводнай, а ў Завадах дзве.

**Анна Зінчук, КАНЦАВІЗНА:**

Пасля вайны нашу вёску шэсць разоў рабавалі, а на сёмы спалілі. Мужчыны і старэйшыя хлопцы ўцякалі тады ў стагі над Нарвай. Рабаўнікі былі панакрываты плахтамі, прыходзілі, заганялі ў камору і адтуль выклікалі і пыталі як хто называецца; дарослых дзяўчат гвалтавалі. Праўдападобна былі гэта суражакі, бо пасля пры гарэлцы выгаворваліся хто хадзіў. Калі палілі вёску, згарэла пяць хатаў і ўсе стадолы. Забілі аднаго чалавека.

**Мікалай Лук'янюк, БЯЛКІ:**

Восенню 1946 г. мой старэйшы брат (нар. у 1929 г.) пайшоў у міліцыю, сказаўшы, што гаспадарку пакідае малодшаму, значыць, мне. Пасля абучэння ў Клюкове ў Высока-Мазавецкім павеце перанеслі яго ў Пекуты та-

го ж павета. У красавіку 1947 г. на майго брата ды яго калег Рыгора Яроцюка з Каменя, што ў Гайнаўскім павеце і Станіслава Багдановіча, сына ляснічага з-пад Аўгустава напала банда „Бурага”. Па сённяшні дзень не ведаем, дзе знаходзяцца іх целы.

## Марыя Малашэўская, БАНДАРЫ:



Мазурэ майго мужа, Янку, забілі на рускага Міколу, у сорак пятым, у маі. Чатыры труны ў царкве ў Патоцы стаялі. 56 год з таго мая ідзе, як яго няма. У трыццаць год яго забілі, за тое, што праваслаўны. Пеpaжыла! А што іх было! Як цёмная хмара стаялі ў вёсцы. Як запальвалі Патоку, то спачатку кінулі ракеты чырвоную ды зялёную. Падымалі салому, падпальвалі стрэхі хатаў. Ад дыму нічога відна не было. Усю вёску хацелі знішчыць, каб ано палякі засталіся. Толькі адна руская хата не згарэла. Гэты мазуры хацелі, каб Польшча правая была. Эркаэм мелі, аўтамат, вінтоўкі, вазы. А патронамі былі паперавязваны о так, і о так. Я дзяцей павыкідала на лонку, на мурог...

Меў мой Янка з першай жонкі сынка і дачку, Юрка і Зосю. Нарадзіла я яму Зіну і Янка. Амаль пяць год разам пражылі. Калі тое стала, Зіне было тры гады, малому два месяцы...

Забілі тады падсолтыса, солтысавага сына, паручніка, майго, брата... Бабу прывялі біць. Аднаму прастрэлілі нагу. Страляніна была, як на фронце. Ой-ой! У вайну так не было, як немцы стаялі, адыходзілі. Паручніка забралі, бо ён жыд быў. Раздзелі яго дагала, як маці нарадзіла, здзекаваліся з цела. Людзі ў поле ішлі, вясна...

...Ведаем, хто забіваў. Сустракаліся потым. Адзін, з Багнюкоў, пасля вазіў малако ў малачарню ў Міхалове. Сам мне прызнаўся, як падвозіў. Разгаварыліся.

Я, каб пісьменная была, то іначай з ім гаварыла б! А гад! А чаго майго мужа біў?!

...Куды ж мне ісці, калі ўсё спалена? Вярнуўся быў мой брат з Нямеччыны, дзе рабіць мусіў. Прыехаў на ровары. Кажа, забяру цябе дадому з дзецьмі, буду пасабляць, пакуль падрастуць. Толькі не плач. Прыехалі браты, сабралі на дзве фуры ўсё маё. А па мужавых дзяцей прыйшла з Каўпакоў родная баба з цёткай, забраць дадому. Дом адзін стаяў, Раманчуковы, плоту кавалак. Ухапіліся тыя дзеці за баляскі, крычаць: нікуды не пойдзем — куды наша мама, туды і мы! Ды куды ж ім ісці, як не да радні? Я спачатку закрычала на іх: „Вонце, заменкі! Куды мне з вамі ехаць?! Ваш бацька не жыве, ці вы мне патрэбны! Што я ў 27 гадоў зраблю з чатырма дзяцьмі?!" А пасля сама сябе па лобе: што я кажу тым сіроткам?! А ці я ведаю, хто будзе маіх гадаваць, калі б раптам мяне не стала?! Адзеў іх усіх мой брат і на воз усе чацвёра пасадзіў.

Вёска яшчэ дапальвалася. У хаце праваслаўных суседзяў, што засталася, хлеб мелі. Нажавала я хлеба, у пялюшку ўвязала, у рот маломy ўсадзіла, каб не плакаў, каб хоць пераехаць Геранімова. Бо там, у тых мазуроў, тыя забойцы трымаліся, там іх кармілі. Прыляцелі рускія, збамбілі той маёнтак. Пабралі іх. Гналі іх цераз вёску, рукі ўсе трымалі о так, галовы пазгіналі; гналі іх на Заблудаў. Але не ўсе вярнуліся.

Паўтара года плакала. І цяпер яшчэ плачу на ўспамін. Чацвёра сіротак! Зажыла я гора, ой, зажыла, пакуль іх выхавала, абрабіла гаспадаркі сваю і мужаву (за 20 кіламетраў ад Гарбароў). Дзецям была і за тату, і за маму. Трапляліся і кавалеры, і ў прымы хацелі прыходзіць, але я „не" сказала. Адзін у мяне Янка быў.

А цяпер якое *пражыце*? Якое яно ёсць, калі папраўдзе адна жывеш? Старэйшыя павучыліся, у Беластоку ў блёках жывуць. Дачка ў Альхоўцы, сын во тутака. Будуецца. Божа, малюся, каб адумаўся, каб уразумеўся. Жыццё ж трэба шанаваць, дзякаваць Богу за тое, што маеш!

Ды людзям так цяжка было і ёсць — усе гэтыя плягі руйнуюць і ломяць жыццё чалавечае...

## Канстанцін Масальскі, БЕЛАСТОК:

У маі 1945 года ў Патоцы здарылася трагедыя. Аднойчы прыехалі жаўнеры ў Тапаляны, а потым паехалі ў Патоку. Не магу сабе прыгадаць, ці было гэта пасля першага ці другога нападзення атрада „Зыгмунта" на гэтую вёску. Пачулі мы тады страляніну, а пасля пабачылі зарыва пажару. У выніку згарэла ўся вёска і трое дзяцей (Яўгенія, Мікалай і Ніна Гарасімчукі). Уладзіміра Малашэўскага спачатку ўдарылі прыкладам у галаву і твар, а пасля забілі. Трафейным аўтамабілем захопнікі ад'ехалі ў маёнтак Геранімова, дзе скрыліся ў павеці. Калі прыляцеў разведвальны самалёт, адзін з жаўнераў пачаў страляць у яго. Ад скінутай бомбы павець згарэла. Познім вечарам жаўнеры прыехалі на аўтамабілі ў Тапаляны і ўсім, хто сядзеў на лавачках, загадалі разысціся па хатах, а самі пайшлі да прыхільнікаў падполля.

Да майго цяжка хворага дзядзькі Юзафа прыйшоў адзін асобень і пасля кароткай размовы сказаў: „Шкада на цябе кулі, і так здохнеш, кацап". У той дзень адзін жыхар Тапалянаў уступіў у атрад „Зыгмунта" і пасля загінуў у ваколіцах Бельска-Падляшскага. Адыходзячы з Тапалянаў захопнікі спалілі самаход, а самі падаліся на калёнію Паплаўскіх, у Затапаляны. Неўзабаве з'явіліся салдаты Народнага Войска Польскага і ў дзядзькавым доме раскватараваўся камандзір. Сказаў ён, што іх камандаванню вядомае месца прабывання атрада „Зыгмунта", але яны не будуць ліквідаваць гэты падпольны атрад з-за няўхільнай смерці некаторых жаўнераў. У нападзенні на Тапаляны прысутнічаў Чэслаў Янэчак.

Гуляючы з сябрамі на лузе, ідучы берагам ручая, працякаючага каля клуні Люлевіча, у вадзе заўважыў я вінтоўку. Гляняў я на клуню і заўважыў яе ўласніка. Пакінуў я сяброў і паспяшаў расказаць аб усім дзядзькам Юза-

фу і Ігнату. Яны прыказалі мне нікому аб гэтым не расказваць.

Глыбокі след у маёй псіхіцы пакінулі здарэнні 1946 года. Калі я прыехаў дадому, пабачыў разбітыя шыбы і пабітага бацьку ў ложку (на ягонай спіне і руках былі сінякі ад пабояў шомпалам). Аказалася, што ў дзверы загрукала быццам войска польскае. Калі маці адчыніла дзверы, атрымала ўдар у грудзі і пакацілася пад сцяну. Не дазволілі запаліць газавую лямпу, свяцілі электрычнымі ліхтарыкамі. Адны сталі рабаваць хатнюю маёмасць, іншыя білі бацьку, ускрыкваючы: „Вон, кацап, за лінію Керзана!" Забралі нам ровар–дамку. Адыходзячы, прыгразілі, каб нідзе і нікому не дакладваць, бо інакш загіне ўся сям'я. Праз нейкі час бацька паехаў на млын у Заблудаў. Там сустрэў знаёмага, які запытаў чаму ён так бедна апрануты. Бацька сказаў яму пад сакрэтам хто яго абрабаваў. Некалькі дзён пазней атрымаў ён папярэджанне, каб схавацца, бо яму пагражае смерць за выяўленне прозвішчаў рабаўнікоў. Бацька скрываўся тры гады. Бандыты прыходзілі да нас яшчэ тройчы. Маці не пускала іх у хату, тады яны білі шыбы і адыходзілі. Схаваны бацька чуў такую размову: „Улезь цераз акно і застрэль яго". „Калі ты такі разумны, то сам лезь. А можа гаспадар стаіць з сякерай пры акне, тады я застануся ў акне, а ты застанешся ў жывых". Пазней бацька распазнаў свае зрабаваныя кажухі і іншую вопратку на сямейніках рабаўнікоў. А тыя пераважна арудавалі ў чатырох вёсках: Фальваркі–Тыльвіцкія, Малынка, Альшанка і Ахрымавічы. З рук падпольшчыкаў загінулі тады Канстанцін Сцепановіч (забілі яго „Жолондзь" і „Тыгрыс"), Віталій Трахімчук і Аляксандр Валасевіч таксама сталі ахвярамі групы „Жолондзя". Шырокім рэхам адбіўся напад групы з 50 чалавек пад камандай „Марка" на Міхалова. Пры ўваходзе ў мястэчка намагаліся яны разбіць савецкі пункт сувязі, у якім працавалі тэлефаністкі. На дапамогу сувязісткам прыйшлі чырвонаармейцы. Захопнікам прыйш–

лося спешна адступіць. Таксама беспаспяхова закончыўся іх план паходу на Заблудаў.

## Рыгор Місюк, ЯЦЭВІЧЫ:

Пасля вайны сталі ў нас банды хадзіць. У Страблі чыгуначнага майстра на мост завялі і ў рэчку спусцілі невіноўнага чалавека толькі таму, што праваслаўны быў. І ў млыне аднаго забілі.

У Яцэвічы банда прыходзіла два разы. Першы раз брата ў Страблю забралі, але пусцілі. А другі раз забралі з вёскі пяць коней; ад мяне двое. А жонка з адной дзяўчынай на падворку ўцякалі; жонка бліжэй будынкаў бегла і яе не трапілі, а тая дзяўчына бегла пасярэдзіне, ранілі яе ў жывот і яна ад тых ран памерла. Адзін чалавек прывёз са станцыі ў Страблі жонку, што з Бельска поездам прыехала. Забралі яго і пасля нейкага часу ксёндз у Вышках аб’явіў, што забіты чалавек у яме ў лесе ляжыць.

Забіралі кажухі, абутак, гадзіннікі. Цешча прасіла, каб ім хоць аднаго каня пакінулі, то адзін даў так прыкладам у грудзі, што два гады хварэла і памерла.

Пасля ў нас арганізавалі апалчэнне, мо з дзесяць чалавек пільнавала вёску, пакуль не супакоілася. А цяпер убоўцаў, што тады парадак наводзілі, праследуюць, а тых, што людзей мардавалі, не шукаюць.

## Барыс Палоцкі, АЗЯБЛЫ:



У 1946 ці 1947 годзе мяне з бацькам пасадзілі ў турму. Ставілі нам закід, што мой нямецкі швагер пакінуў нам ружжо, якое мы хаваем. Сядзелі мы ў Беластоку, у турме, што па вуліцы Міцкевіча, 5. Білі нас, катавалі.

— Мы нічога пра ніякае ружжо не ведаем, — тлумачыліся мы.

— Але калега ведае, — адказвалі нам.

— Дык няхай той калега і пакажа.

Удалося нам паведаміць брата, што мы сядзімо па вуліцы Міцкевіча. Брат прыехаў у ваяводскі камітэт партыі, а там яму адказваюць, што нічога ім пра нас невядома. Ён прыехаў у камітэт яшчэ раз і сказаў, што паедзе да Берута хадайнічаць у нашай справе. І ў той жа дзень нас выпусцілі з турмы.

Пасля майго выхаду з турмы Хлябіч, што з Рыбакоў, які працаваў у камітэце ў Міхалове, узяў мяне да сябе на працу памагаць яму, бо ён толькі па-руску ўмеў. Я яму дапамагаў, а праз нейкі час паслаў ён мяне на юрыдычныя курсы ў Торунь. У Торуні быў паўгода, а на чарговае паўгода перавялі мяне ў Забжа вучыцца на пракурора. На тых курсах трэба было грунтоўна вывучыць „Капітал" Маркса, а „Камуністычны маніфест" вызубрыць на памяць. Недзе пад канец тых курсаў выявілася, што мой швагер немец і мяне адтуль выдварылі.

## Міхал Панфілюк, НАРАЎКА:

Пасля вайны людзі паверылі народнай уладзе і сталі будаваць новае жыццё. Мяне выбралі радным Арлянскай гміны. Час быў неспакойны. Сям-там па начах грымелі выстралы, дзейнічала па лясах узброенае падполле. У Нараўцы атрад Лупашкі расстраляў членаў ППР. А мяне назначылі войтам у Нараўцы. Кашмарам сялян былі тады абавязковыя пастаўкі збожжа і мяса. Не адзін войт усім не дагадзіў. Былі выпадкі, калі страшылі мяне сякерай, але астаўся ў жывых. Варожка праўду гаварыла.

## Віктар Паўлючук, ГАЛАДЫ:

Прыехалі якіясь уначы, ад Катлоў ішлі, трыццаць пяць чалавек. Мяцеліца, снег, а яны каб падводы даць. Я кажу, што сяло спалена і ў каго няма каня, у каго воза. Але пайшоў я заказваць. Прыйшоў, а яны пытаюць, па-польску: Ну, як, заказана? Заказана, адказаў я. Але ж прыходзіць салдат і кажа, што меў быць чалавек, а яго няма,



бо на вяселле выехаў. А ў яго трое коней было; я мог пра гэта сказаць, але пайшлі б і забілі б яго. Я адказаў, што спіска не вяду, куды хто выязджае. Пайшоў я да другога гаспадара і кажу, — а ноч была — што фурманку трэба. А ён кажа: Як трэба, то трэба, нічога не зробіш. Выйшаў я і думаю: Што рабіць? Заб'юць, думаю, тыя акаўцы, калі ўжо так чапляюцца да нявëдзь чаго. А што з сям'ёю? Пабег бы ў карчы і прапаў бы, і хто знайшоў бы; але тады сям'я адказвала б... Іду. Пытаюць: Як? Ужо заказана, адказваю. Выходзяць, а я пытаю: Чым я апраўдаюся, калі ў гміну зайду? Ну і напісалі мне дакумент, што з Галадоў узялі сем падводаў. А я кажу: Што ж гэта за квітанцыя, калі тут не напісана калі ўзята і кім узята?! Ну і дапісалі яшчэ дату — 1946 год — і подпіс „Жбік". Нашы завезлі іх у Орлю і вярнуліся ўсе, а куды тыя далей паехалі, ніхто не ведаў. А мне трэба даць вестку ў павет. Даручыў аднаму *данос*, а ён мнецца: Не пайду! Твая справа, адказаў я, я табе даў, а ты зрабі. То ён дачакаў дня і пайшоў. Зараз два самаходы салдат прыслалі, але куды яны паехалі далей — не ведаю.

Я быў солтысам ад 1944 да 1948 года. А тады салтысам ні граша не плацілі, толькі пасля сталі ад падатку якіясь працэнты плаціць, якіясь прывілегіі далі. А я ў самы гарачы час чатыры гады адпакутаваў! Нічога, апрача страху, я з таго не меў. Пасля тры кадэнцыі радным у павятовай і гміннай радах быў.

## Уладзімір Рамановіч, АСТРАЎКІ:

Прайшоў я ад Кіева да Дрэздэна з Першым украінскім фронтам. Дэмабілізавалі мяне ў лістападзе 1945 года і толькі тады я вярнуўся ў свае родныя Астраўкі. Вярнуўся як батрак на пустыню пасля 5-гадовага блукання па



лагерах, а потым па сцежках ваенных дарог.

Не меў я ў што пераапрануцца, з чаго жыць. Затрымаўся ў свайго швагра на калёніі Астраўкі і там адбыў першую сустрэчу з бандай „Янэчка", якая ноччу пастукала ў дзверы хаты ягонага швагра. На пытанне хто там, пачуўся адказ: „Otwierać, milicja". Калі ім адчынілі дзверы, на парозе стаяў высокі, стройны чалавек з аўтаматам на грудзях. Убачыўшы мяне ў савецкай уніформе закрычаў: „Edek, chodź tutaj, mamy Ruska" і загадаў: „Ręce do góry". Валодзя рук не падняў. Швагер выскачыў з пасцелі і сказаў: „Што табе, Валодзя, цяжка рукі падняць? Ты ж наш чалавек". Банда забірала ўсё ад сялян — ад саланіны да жаночых майтак. І так я пачаў вайну на другім фронце. Яшчэ некалькі разоў бандыты заходзілі ў хату, гаварылі мне ісці з імі, а калі я адмовіўся, тады параілі зняць савецкія медалі з грудзей і пакінуць хадзіць ва ўніформе байца Чырвонай Арміі.

## Анна Федарчук, СНЕЖКІ

Пасля вайны лясных з навакольных сёлаў да халеры было. Абабіралі і ў Расію выганялі; выехала трэцяя частка вёскі. Накладалі якуюсь кантрыбуцыю, забіралі свіней, абутак, лахі, світэры. Аднаму чобаты забралі і ён пасля пазнаў тыя чобаты і рабаўніка нажом упароў і той у шпіталі памёр. А той што забіў, два дні пазней у СССР выехаў. І світэры зрабаваныя пазнавалі, але ўжо не чапалі, бо баяліся.

## Уладзімір Хмель, ВІТАВА:

Акаўцы, няхай іх гром спаліць, бандыты былі, больш ніц. „Do raju" нас выганялі.

Забілі майго брата Цімафея, бо быў партыйны. Брат хацеў у Расію ехаць.

Карніла Васілюк быў тады солтысам у Вітаве. Паехаў на сход у Гайнаўку. Гарачы быў, гаварыў, што каб меў ружжо, дык усіх акаўцаў перастраляў бы. І яшчэ пералічыў, хто ў Вітаве надзейны. А там у Гайнаўцы акаўцы былі пры ўладзе, усе ўраднікі былі акаўцы. Хваліўся Карніла, як Вітава добра дзейнічае, дык узяліся акаўцы за Вітава.

Вечарам прыйшоў у хату чалавек у савецкай форме і выклікаў брата. Я гавару брату: „Уважай", але як прыйшоў савецкі афіцэр, дык брат пайшоў.

У нас быў Кавальскі Болек. За немца збожжа прымаў у Орлі.

Акаўцы яго забралі. Валодзя Германюк сказаў: „Хлопцы, не рассасулівайце".

Вечарам у 10 гадзін акаўцы прыйшлі ў нашу хату, пачалі грабіць. „Czego ty, skurwysynu, do raju!" гаварылі.

Мы якраз забілі свінню, мяса жарым. „Давай сала", — крычаць. Мая баба, як кожная, скупаватая, кілаграм прынесла. Сказалі, што самі пашукаюць і ўсё забралі. Забралі сундук з бялізнай, гадзіннік. Быў у мяне суседскі сундук, пайшоў я за ім. Пайшоў са мною адзін акавец. Як вярталіся, дык я думаў, што тут ён мяне і пакладзе, але адпусцілі.

Я меў аўтамат у клуні і дубальтоўку ў лесе, але ж зняччэўку нас узялі. Сказалі: „Masz broń". Думаю, Карніла і брат выспавядаліся, але гавару: „Шукайце", бо быў упэўнены, што не знойдуць.

Як скончылі, дык пачалі піць і пілі, пілі. Ажэлкі мелі з каронаю, раніцай маліліся і жагналіся.

## Уладзімір Чапко, РОГАЎКА:

Пасля дэмабілізацыі з Савецкай Арміі 30 кастрычніка завезлі мяне на вакзал, сеў я на поезд і на досвітку 8 лістапада 1945 года прыехаў на станцыю ў Сямятычы. Дома была толькі мама.

Мінула некалькі тыдняў. Ноччу дабіваюцца чатырох:

— Otwórz! W imieniu Polski Podziemnej...

— Ja was nie znam, ja dwa tygodnie temu wróciłem...

Тут адазваўся найменшы з іх:

— Odejdź od niego! On niewinny, to inny.

І пайшлі. Але больш не прыходзілі. Нядаўна я пачуў, што мелі яны загад ліквідаваць тых, хто з усходу вярнуўся.

## Лідзія Юхімук, ТЫМЯНКА:

Хадзілі банды, грабілі ўсё, што хто меў. Аднойчы нейкае войска ішло праз нашу вёску, а за ім другое; тады Вульку-Выганоўскую спалілі. А да нас прыходзіла банда з Ажэлкаў і накладала кантрыбуцыі. Наш адзін сусед меў сына ў міліцыі, а другі два вепрукі прадаў і грошы за іх меў. Грабежнікі прыйшлі ў адну ноч, але той міліцыянер быў і яны пабаяліся. А ў другую ноч прыйшлі і тых суседзяў падпалілі.

Заняліся і нашы будынкі, што паміж суседнімі былі. Мы спалі на сене, кінуліся ратаваць наша дабро. Бачу: тата сундук з хаты выцягае, а ў яго сарочка на плячах гарыць. Я схапіла той сундук і разам з татам выцягнула. Пазбягаліся суседзі, выпусцілі скаціну, коней, авечак. А я яшчэ сама сячкарню на двор выцягнула. Да зімы паставілі мы хату і ў тую самую зіму я з тае хаты замуж выходзіла.

## НН, ЧАРАЎКІ:

Неўзабаве стала арганізавацца новая ўлада: нас далучылі да гміны Завыкі з сядзібай у Рынках. Солтысам у Чараўках выбралі таго самага чалавека, што пры саветах і пры немцах быў — Мікіту Іванюка. Сталі ў нас арганізаваць партячэйку і маладзёжную арганізацыю...

Да вайны ў навакольных беларускіх вёсках дзейнічала КПЗБ: у Чараўках, Храбалах, Плютычах, Райску. У нашай вёсцы было двух актывістаў, якія пры санацыі нават па два гады ў турме сядзелі: Максім Врублеўскі і Аляксандр Дзядзюлюк. Пасля, пры саветах, яны не пагадзіліся і ў 1944 годзе Дзядзюлюка вывезлі на два гады ў шахты ў Сталінагорск, адкуль ледзь жывы вярнуўся

і ўжо нідзе не дзейнічаў: ні ў ППР, ні ў спулдзельню прадукцыйную не пісаўся...

Прыязджалі агітатары з Беластока, але і тут быў актывіст — Даніла Купрыянюк, які гмінным сакратарам у Рынках працаваў. У Чараўках да ППР запісалася дзесяць чалавек; былі пэпээраўцы і ў Заячках, Кажанах, Дарожках, Баранках...

Хадзілі банды, нападалі на нас быццам за тое, што саветы польскіх афіцэраў пабілі. Тройчы грабілі Чараўкі і Кажаны, іншыя вёскі менш, а на большыя — Войшкі, Плёскі ці Плютычы — баяліся. Забіралі вазы, коней, швейныя машыны, кажухі, палатно, свіней — усё. Гаварылі, што яны з АК; прыходзілі яны, бадай, з Самулкаў.

Купрыянюк стаў арганізаваць ахову, збіраць ружжо. Арганізавалі варту: двух да поўначы пільнавала вёску, а двух пасля. Ішла банда ад Пухлаў, там людзей пабілі. Пачалі дабівацца да бацюшкі. А ён загадзя працягнуў шнур ад плябаніі да званіцы, залез на гарышча і пазваніў. Банда стала перапраўляцца праз Меньку, а мост на ёй размыты быў. І нашы вартавыя ўзялі іх у два ручныя кулямёты, былі яшчэ аўтаматы, карабіны і пісталеты. Банда пакінула ўсе падводы з амуніцыяй, асталіся і два панцэрфаўсты і дзве свінні; вазакі былі з Пухлаў.

Банда ўцякла і цэлы дзень на хутары ў Налівайкі сядзела, нікога не выпускаючы з хаты. Пасля змяркання пайшлі яны на Баранкі, адкуль забралі шэсць падвод: тры праваслаўных і тры католікаў. Праваслаўных расстралялі ў лесе каля Петкава і там закапалі, а католікі вярнуліся цэлыя. Пасля радня забітых ездзіла з рускімі салдатамі забіраць пабітых. Забілі двух Трусюкоў (50 і 18 гадоў) і дзяўчыну, сірату з Райска, якая ў Германюка ў Баранках пасвіла дабытак, бо гаспадар яе адправіў з падводай... Пасля ўжо банды, калі пачулі ў нас порах, перасталі нават грабіць прыходзіць. Ды і сталі ў нас арганізаваць ОРМО...

З Чараўкоў і Кажан было пяцьдзесят армоўцаў, з Заячкаў, Баранкаў і Завык — па дваццаць, з Канцавізны

і Завык-Фермы — па дзесяць. Усіх разам было каля паўтары сотні; атрымалі ружжо, амуніцыю, некаторыя нават гранаты. У Чараўках быў цэлы штаб. Нашы армоўцы памагалі арганізаваць выбары ў Рынках, ездзілі таксама ў Высока-Мазавецкі павет; людзі маладаватыя былі, баявітыя, жартаў не было!

**Адгалоска:**

Спадар НН, вы, мабыць, найстарэйшы чалавек у Чараўках. Вы добра памятаеце 1946 год, калі адбываліся рабаванні вёсак Чараўкі, Кажаны, Дарожкі, Баранкі. Многа вашых людзей было варожа настаўленых да жыхароў Дакторцаў і часткова мелі яны рацыю. Але так, як у Чараўках не ўсе належалі да камуны, так у нас не ўсе належалі да банды НСЗ, бо так трэба назваць гэту групоўку. Да НСЗ належалі людзі з Туросьні, Чачак-Вялікіх і Малых, Зімнохаў, Лешні і Дакторцаў. У Дакторцах былі дзве дружыны. Адзін з камандзіраў дружыны пабачыў, што гэта ніякая не палітыка і сваіх людзей не пусціў. Тады хацелі яго застрэліць, але ён не пахіснуўся і адчапіліся ад яго. Другі камандзір паслаў трох людзей, але як першаму нічога не зрабілі, тады яго таксама пакінулі ў спакоі. Пры нямецкай акупацыі арганізацыя вяла сябе карэктна, але пры ПНР адны зладзеі з Беластока, якія камандавалі гэтай арганізацыяй, знюхаліся са злодзеямі з УБ, увайшлі ў кантакт і стварылі мафію. Адны ішлі і рабавалі, а другія праз два дні ехалі шукаць зладзеяў, а нарабаваным дзяліліся паміж сабою. Кажухі, швейныя машынкі і вепрукі заставаліся ў Беластоку, а коней грузілі ў вагоны і везлі на захад, на вернутыя землі. Лёгка было іх знайсці, бо ў коней былі пашпарты. Ні радавы функцыянер УБ, ні такі ж член НСЗ аб гэтым не ведалі, бо ім гаварылі, што нарабаваныя грошы прызначаюцца сіротам і ўдовам па членах арганізацыі. А яны пакуплялі сабе дамы ў Гданьску — камандзір кампаніі Курловіч Міхал са Старасельцаў і шэф кампаніі Сокул. Аказалася, што апошні быў агентам УБ. А функцыянеры УБ пакуплялі сабе дамы ў Беластоку. А прыстойным жыхарам гэтых вёсак засталася ганьба на доўгія гады.

**Сумленне**

Пераклад з польскай мовы, „Ніва"№ 12, 21.03.2004